**Д. А. Лукша**

# ЭТНАКУЛЬТУРНЫ КОД БЕЛАРУСАЎ У АПОВЕСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА “ЛАДДЗЯ РОСПАЧЫ”

Паняцце культурнага кода набірае папулярнасць сярод навукоўцаў, якія працуюць у галіне даследвання этнасаў і іх культуры.

У дадзенай працы мы будзем выкарыстоўваць наступную трактоўку: “культурны код – гэта набор нацыянальна-дэтэрмінаваных і звязаных паміж сабой вобразаў і ўяўленняў, якія фарміруюць нацыянальную карціну свету асобнага народу” (Сычава Н. А.). Мэта нашага даследвання – вызначыць вобразы-архетыпы культуры беларускага народу і знайсці заканамернасці іх адаптацыі ў літаратуры.

Для разгляду і аналізу мы ўзялі аповесць Уладзіміра Караткевіча “Ладдзя Роспачы”. Выбар абумоўлены насычанасцю твора міфалагічнымі вобразамі-архетыпамі (знойдзена больш за 15). Гэтыя архетыпы у дадзеным кантэксце з’яўляюцца адлюстраваннем ментальнасці і гісторыі беларускага этнасу.

Першы вобраз для разгляду – вобраз вады. Стыхія вады з’яўляецца адной з асноўных касмічных стыхій, таму гэты сімвал прысутнічае ў шматлікіх культурах. Наяўнасць вобразаў-архетыпаў ва ўсіх культурах абумоўлена паняццем “калектыўнае падсвядомае”, вызначанае К. Юнгам. Вада адыгрывае важную ролю ў міфалогіі Беларусі. Праводзіліся шматлікія абрады з ўдзелам вады, што адлюстроўвае яе ўплыў на чалавека на падсвядомым узроўні. У творы стыхія вады увасабляецца ў некалькіх вобразах: як рака, возера (“мора”) і слёзы. Згодна з энцыклапедычным слоўнікам

“Беларуская міфалогія”: “… Вада – мяжа паміж “гэтым” і “тым” светам, шлях у іншасвет, месцазнаходжанне душ памерлых і нячыстай сілай…”. Гэта тлумачыць з’яўленне ў творы вобразу ракі – мяжы пераходу ад жыцця да смерці. Далейшае месцазнаходжанне героя – мора, па якім ладдзя пера-праўляе нябожчыкаў у іншасвет. Наступны архетып – слёзы. У казках слёзы з’яўляліся “жывой” вадой, кропля якой магла ўваскрэсіць істоту. У творы слёзы знішчылі плесню на вачах перавозчыка, што паказвае ў нейкім сэнсе “перамогу” жыцця над смерцю нават у падземным свеце памерлых.

Вобраз-архетып кветка шыпшыны, які ў беларускай міфалогіі сімвалізуе боль і пакуты. Так і ў творы, Выліваха сарваў перад адыходам са Смерцю кветку шыпшыны. У дадзеным кантэкце шыпшына выкарыстана як сімвал радзімы, якую герою было балюча пакідаць.

Вывучэнне архетыпаў у літаратура свайго народа дазваляе разгледзець культуру краіны, больш дакладна зразумець асаблівасці развіцця этнасу.

У нашай працы вылучана толькі два сімвалы беларускай культуры, далейшыя даследванні дапамогуць у поўнай ступені раскрыць вобразы з аповесці і адлюстраваць моўную і культурную карціну свету беларускага этнасу.